З каталіцкіх СМІ (184)

Аўтар: Рэдакцыя
24.03.2019 00:00

Крыжовы шлях анлайн ***Усе, хто не мае магчымасці быць у касцёле, можа далучыцца да велікапоснага набажэнства праз інтэрнэт.*** Спецыяльна для хворых, а таксама тых вернікаў, якія па важных прычынах не ўдзельнічаюць у набажэнствах Крыжовага шляху ў сваіх парафіях, каталіцкі партал Catholic.by прапануе прамыя трансляцыі з парафіі св. Яна Евангеліста і св. Максімільяна Кольбэ ў Мінску. Яны праходзяць кожную пятніцу на працягу Вялікага посту ў 19.00.
†

Паніхіда па бяздомных ***Адмысловую службу ў Кіеве (Украіна) арганізавала супольнасць св. Эгідзія.*** Падчас паніхіды ўспомнілі людзей, якія жылі на вуліцы і загінулі ў маразы. Пасля госці, якіх сабралася больш за сотню, былі запрошаны на абед. Супольнасць св. Эгідзія – гэта міжнародная арганізацыя, якая існуе ў больш чым 70-ці краінах свету. Вядомая сваёй міратворчай і гуманітарнай дзейнасцю. Дапамагае бяздомным, бежанцам, пажылым людзям, дзецям з малазабяспечаных сем'яў.

Святы Айцец узнагароджаны за мір ***Папа Францішак і Вялікі імам Аль-Азхар Ахмед эль-Таеб сталі першымі лаўрэатамі Прэміі чалавечага братэрства (Human Fraternity Award), заснаванай эмірам Дубая Мухамедам бэн Рашыдам. Узнагарода прызначана за намаганні па забеспячэнні міру ў свеце.*** Пантыфік, Вялікі імам, наследны прынц Абу-Дабі і эмір Дубая пакінулі свае подпісы на вуглавых камянях пад будаўніцтва новага касцёла

св. Францішка і новай мячэці імя Вялікага імама Ахмеда эль-Таеба ў Абу-Дабі. Святыні павінны стаць сімваламі папскага візіту ў Аб’яднаныя Арабскія Эміраты. “Яны будуць служыць у якасці маякоў, якія ахоўваюць каштоўнасць цярпімасці, маральнай праўды і братэрства паміж людзьмі ў нашай краіне”, – выказаўся шэйх Мухамед бэн Заід.